Вызначэнне захаванай часткі скарбу паказала, што манеты прадстаўлены капейкамі трэцяй чвэрці XVII ст. з імем рускага цара Аляксея Міхайлавіча (1645–1676). Комплекс складаецца з 1 срэбнай, 221 ці 222 медных капеек, а таксама 1 капейкі, метал якой не вызначаны. Сярод манетнай медзі выяўлены манеты маскоўскай (23 адз.) і пскоўскай (57 адз.) чаканкі. З-за моцнай карозіі 105 манет складана аднесці да аднаго з вядомых дзенежных двароў. 36 ці 37 манет уяўляюць сабою слупкі па 2–3 адзінкі, сярод якіх прысутнічае маскоўская і пскоўская чаканка.

Верагодная прычына тэзаўрацыі скарбу з в. Ішкалдзь крыецца ў бурлівых падзеях вайны Рускага царства і Рэчы Паспалітай 1654–1667 гг. Вядома, што ў чэрвені 1660 г. рускія войскі пацярпелі паражэнне недалёка ад в. Палонка (цяпер – Баранавіцкі раён). Не выключана, што знойдзены комплекс мог быць маёмасцю аднаго з рускіх вайскоўцаў, які ўдзельнічаў у гэтай бітве.

**Р. І. Крыцук, А. М. Плавінскі**
*Мінск, Беларусь*

# МІНСКІ СКАРБ МАНЕТ XVII ст. СА ЗБОРУ МЮНЦКАБІНЕТА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

Скарб быў знойдзены ў перыяд з 1996 г. па 1998 г. ў Мінску, за Палацам спорту (цяпер – праспект Пераможцаў, 4) на беразе р. Свіслач. Дэпазіт быў перададзены В. Н. Рабцэвічу В. А. Сазонавым. Скарб складаецца са 121 манеты, большая частка з якіх – зацёртыя і моцна пашкоджаныя вокісламі.

У складзе дэпазіта абсалютна пераважаюць шэлягі Шведскай Прыбалтыкі, а таксама фальсіфікаты гэтых манет. У невялікай колькасці маюцца манеты Рэчы Паспалітай. Чаканка Прусіі прадстаўлена адным шэлягам.

Склад скарба:

***Эльблёнг:***

*Хрысціна Аўгуста (1632–1654),* шэляг 16XX г.

***Шведскія Інфлянты, Рыга:***

*Густаў II Адольф (1611–1632),* шэлягі 1626 г., 1628 г.;



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

*Хрысціна Аўгуста,* шэлягі 16ХХ (7 адз.) г., 164Х (2 адз.), 165Х г., 1641 г., 1644 г., 1645 г., 1648 г., 1649 г., 1650 г. (2 адз.), 1651 г. (3 адз.), 1653 г. (2 адз.);

*Карл Х Густаў (1654–1660),* шэлягі 165Х г., 1654 г. (2 адз.), 1658 г. (2 адз.), 1659 г. (2 адз.);

*Карл XI (1660–1697)*, шэлягі 16ХХ г. (3 адз.), 1661 г. (3 адз.).

***Шведскія Інфлянты, Лівонія:***

*Хрысціна Аўгуста*, шэлягі 16ХХ г. (9 адз.), 165Х г., 1647 г., 1648 г. (4 адз.), 1649 г., 1650 г., 1651 (3 адз.), 1652 г (4 адз.). 1653 г. (2 адз.);

*Карл Х Густаў,* шэлягі 16ХХ г. (3 адз), 1657 г. ;

*Карл XI*, шэлягі 16ХХ г. (4 адз.), 1661 г.

***Прусія (леннік Рэчы Паспалітай):***

*Фрыдрых Вільгельм (1640–1657)*, шэляг 1654 г.

***Рэч Паспалітая (Рыга):***

*Жыгімонт III Ваза (1587–1632)*, шэлягі 1620 г. (2 адз.).

***Рэч Паспалітая (Вялікае Княства Літоўскае):***

*Жыгімонт III Ваза*, шэляг 1623 г. ;

*Ян II Казімір Ваза (1648–1668)*, шэляг 1652 г. з гербам "Газдава".

***Рэч Паспалітая (Польшча):***

*Жыгімонт III Ваза*, тэрнарый Лабжэніцы 16ХХ г., паўтарак 1626 г.

***Фальшывыя манеты:***

*Хрысціна Аўгуста*, шэляг 16ХХ г.,

*Хрысціна Аўгуста*, шэляг 1635 г. (магчыма, манета сапраўдная)

38 фальшывых манет належаць, верагодна, да эмісій менніцы ў Сучаве (Малдаўскае княства). Яны біліся пры гаспадары Эустраціе Дабіжа (1661–1665), а магчыма і пэўны час пасля яго смерці:

- *Хрысціна Аўгуста, Рыга*, шэлягі з наступнымі датамі: 16ХХ г. (4 адз), 16Х0 г., 1616 г. (3 адз.), 1655 г., 1657 г., 1658 г., 1660 г. (9 адз.).
- *Хрысціна Аўгуста, Лівонія,* шэлягі з наступнымі датамі: 16ХХ г., 16Х6 г., 1660 г.
- *Карл Х Густаў, Рыга,* шэлягі з наступнымі датамі: 16ХХ г. (3 адз.) 1612 г. (2 адз.), 1616 г., 1660 г., 1661 г., 166Х г., 1666 г.
- *Карл XI, Рыга,* шэлягі з наступнымі датамі: 16ХХ г., 1660 г. (4 адз.).

Скарб быў захаваны ў 1661 г. або пасля яго. Яго тэзаўрацыя, хутчэй за ўсё, не была звязана з вайной 1648–1667 гг., бо Мінск быў вызвалены ад маскоўскіх войск яшчэ ўзімку 1658–1659 гг.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm